халоднае ківі ем на сняданак

колькі дзён да зімы

сябры ўжо бачылі снег
я ж плятуся ў хвасце
у мяне лістапад

багоўка на падваконні
завальваецца на правы бок

засынае
ці недзе адбіла лапку

узгадаць пра сябе
пагадзіўшыся на зазямленне

поле што нідзе не сканчаецца
мусіць займець межы

я – адсюль і дасюль
далей чужыя землі

мо так лепей

і меней стомы

ад уласнай бясконцасці

героі кіно здаюцца рэальнымі

я ж – выдумкай

прычым нічыйнай

я паўзу па падваконні

з адбітай лапкай

ляжу на талерцы халодным ківі

я снег што ніяк не прыйдзе

я бязмежнае поле

я колькі дзён да зімы